Маладыя і ініцыятыўныя

# ЗАПАЛЬВАЦЬ РУХАМ УСІХ

## У Мінску падвялі вынікі трэцяга працоўнага семестра

**Сустрэча дала старт Усебеларускаму злёту студэнцкіх атрадаў «Час руху». У канцэртнай зале ЗАТ «Атлант» сабралася больш за 500 юнакоў і дзяўчат з усіх рэгіёнаў краіны, а таксама ветэраны руху і кіраўнікі арганізацый, у якіх студэнты працавалі летам.**

Сёлета Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў дапамог працаўладкавацца больш чым 24 тысячам актыўных хлопцаў і дзяўчат. Традыцыйна яны ахапілі розныя кірункі: будаўніцтва, сельскую гаспадарку, сэрвіс, экалогію, медыцыну, вытворчасць. Дапамаглі ўзводзіць аб'екты на двух маштабных праектах — Усебеларускай маладзёжнай будоўлі «Горад маладосці» ў Астраўцы і міжнародным вытворчым працоўным праекце «Атлант-2020», а таксама байцы шчыравалі на палях падчас перыяду ўборачнай кампаніі, шылі адзенне, працавалі важатымі ў летніках. Напрыклад, удзельнічалі ў будаўніцтве школы ў Баранавічах, бальніцы ў Гродне, былі задзейнічаны ў рэканструкцыі брацкага пахавання на месцы спаленай вёскі Ала ў Гомельскай вобласці і на іншых важных аб'ектах.

**Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй КУНЦЭВІЧ,** вітаючы ўдзельнікаў сустрэчы, адзначыў, што за апошнія 15 гадоў з моманту аднаўлення традыцый маладзёжных будоўляў пры падтрымцы Прэзідэнта студэнцкія атрады прайшлі шлях ад рэканструкцыі Аўгустоўскага



канала да дапамогі ў будаўніцтве высокатэхналагічнай БелАЭС:

«На ўсім гэтым шляху студэнцкія атрады былі выдатнай жыццёвай школай для тысяч беларускіх хлопцаў і дзяўчат. Яны прайшлі гэты шлях разам са сваёй краінай, давёўшы шмат каму, што нашаму народу пад сілу вырашыць самыя амбіцыйныя заданы. З усіх сённяшніх кірункаў дзейнасці Саюза моладзі менавіта студатрадаўскі рух з'яўляецца найбольш прыкметным і запатрабаваным праектам. Можна з упэўненасцю казаць, што ўдзел у ім дазваляе паверыць у сябе і сваю Бацькаўшчыну. Гэта вельмі важна. У кожнага з байцоў студэнцкіх атрадаў ужо свая гісторыя — гісторыя першых працоўных дасягненняў і першых няўдач. Вельмі хочацца, каб гэты вопыт дазволіў ім вырасці прафесійна, маральна, інтэлектуальна, бо гэта рухае нашу краіну наперад».

Андрэй Кунцэвіч уручыў пераможцу конкурсу «Працоўны семестр» у намінацыі «Найлепшы працоўны атрад» па выніках 2019 года ўзнагароду і пераходны сцяг Прэзідэнта Беларусі. Найлепшым стаў будаўнічы атрад «Эўрыка» імя Героя Савецкага Саюза В. І. Яронькі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, які працаваў на Усебеларускай маладзёжнай будоўлі.

**Першы сакратар ЦК БРСМ Дзмітрый ВАРАНЮК** падчас цырымоніі закрыцця падкрэсліў: «Студатрадаўскі рух з кожным годам прыцягвае ўсё больш маладых людзей. У гэтым сезоне конкурс у атрады быў да пяці чалавек на месца. Планаў у нас яшчэ вельмі многа. Традыцыйна нашы хлопцы і дзяўчаты працуюць на ключавых аб'ектах ва ўсіх абласцях краіны. На сёння ў нас створаны ўсе ўмовы для таго, каб наш рух развіваўся, набіраў абароты і сваю папулярнасць».

Падчас святочнай праграмы для ўсіх прысутных выступалі зоркі беларускай эстрады і творчыя танцавальныя калектывы краіны. А пасля цырымоніі закрыцця хлопцы і дзяўчаты з ахвотай расказалі нам аб сваім вопыце і ўражаннях ад удзелу ў студатрадах.

**Студэнтка Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта і камандзір медыцынскага атрада «Медык» Кацярына ЖУК** падзялілася, што сёлета яна працавала ў Гродзенскай універсітэцкай клініцы. «Гэта не першы мой досвед, яшчэ летась я ўдзельнічала ў студатрадзе. Такі вопыт, безумоўна, карысны, бо ва ўніверсітэце частка ведаў — тэарэтычная, а практыкі заўсёды не хапае. Таму такі занятак для тых, хто вельмі актыўны і хто хоча развівацца».

**Студэнтка Сібірскага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры і спорту і камандзір міжнароднага вытворчага праекта «Атлант-2020» Хрысціна ХУБУЛАВА** адзначыла: «Студатрад добры тым, што тут можна атрымаць грошы, пры гэтым папрацаваць і адпачыць, а яшчэ — набрацца карыснага вопыту ў кіраўніцтве, пазнаёміцца з цікавымі людзьмі. Гэта магчымасць зарэкамендаваць сябе добрым супрацоўнікам для будучага працаўладкавання. Да таго ж, гэта здабыццё сапраўднага сяброўства».

**Студэнтка Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта Віталія СЕЛІВОНЧЫК, камандзір сельскагаспадарчага студатрада «Парачанка»** з упэўненасцю кажа: «Атрады мяне не проста змянілі, яны падарылі шмат магчымасцяў — раскрыць сябе, свой унутраны патэнцыял, праявіць лідарскія якасці. Тут я другі год арганізоўваю работу атрада, кірую калектывам, хай і невялікім. Для мяне гэта навыкі, якія спатрэбяцца ў будучыні».

Сёлета атрад «Эўрыка» імя Героя Савецкага Саюза В. І. Яронькі, які быў адзначаны як найлепшы, працаваў на Усебеларускай маладзёжнай будоўлі ў Астраўцы. А на байцоўцы яго камандзіра, **студэнта Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта Дзмітрыя ШЧАРБЯНКА** з'явіўся ганаровы значок «Найлепшы камандзір». Дзіма прызнаецца, што ўзнагароду шмат у чым атрымаў дзякуючы таварышам:

«Наш атрад правёў там сваё незабыўнае лета. Мы прыехалі працаваць на розных аб'ектах горада. Хоць гэта займала многа часу і сіл, не забывалі і пра мерапрыемствы, конкурсы. На беларускай студэнцкай будоўлі я правёў ужо тры свае леты. Гэта магчымасць не сядзець без справы, зарабіць грошай. Паглядзець будоўлю на свае вочы — вельмі карысны досвед. Як будучы інжынер-будаўнік, я павінен пабываць і простым рабочым, і майстрам. Лічу, што тэорыя без практыкі мёртвая. Для мяне «Эўрыка» — гэта адна вялікая дружная сям'я. Удзел у студатрадзе падарыў мне новых сяброў, а яшчэ — прафесійны вопыт, які спатрэбіцца ў будучыні».

**Дарʼя ШЛАПАКОВА.**
**Фота Яна ХВЕДЧЫНА.**